

# СКАВАЦЬ НЯМЕЦКУЮ ГРУПУ АРМІЙ «ЦЭНТР»

**сакавік – красавік 1944 г.**



**Анатоль Крыварот,**
вядучы навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт





Другі матэрыял сумеснага праекту часопіса «Навука і інавацыі» і Інстытута гісторыі НАН Беларусі «Освобождение. Хроника событий», прысвечанага 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, раскрывае галоўныя вехі на шляху да Перамогі і падрабязнасці наступальных аперацый Чырвонай арміі на віцебскім, багушэўскім, аршанскім, палескім напрамках вясной 1944 г.

У планах Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання (Стаўка ВГК) на зімова-вясновую кампанію 1944 г. асноўнымі напрамкамі наступлення Чырвонай арміі былі вызначаны паўночна-заходні і паўднёва-заходні. Пры гэтым у якасці галоўнага ўдару па войсках вермахта, як і восенню – зімой 1943 г., быў абраны другі напрамак, дзе меркавалася наступаць сіламі 1, 2, 3, 4-га Украінскіх франтоў.

Войскам 1-га Прыбалтыйскага, Заходняга і Беларускага франтоў на зіму і вясну 1944 г. ставілася задача скаваць нямецкую групу армій «Цэнтр», не дазволіць гітлераўскаму камандаванню перакідваць яе сілы для стрымлівання наступлення войск Чырвонай арміі на асноўных напрамках і вызваліць як мага большую тэрыторыю Беларусі [1].

Пры падрыхтоўцы зімова-вясновага наступлення 1944 г. у першую чаргу забяспечваліся франты, якія павінны былі наступаць у напрамку галоўнага ўдару. Вядучая роля ў пачатку зімовага наступлення 1944 г. адводзілася войскам 1-га Украінскага фронту, для папаўнення якога былі накіраваны з рэзерву Стаўкі ВГК дзве агульнавайсковыя і танкавая арміі, асобныя танкавыя, артылерыйскія і авіяцыйныя злучэнні [1].

Войскам Чырвонай арміі на беларускім напрамку (1-ы Прыбалтыйскі, Заходні і Беларускі франты) людскія рэзервы, баявая тэхніка і матэрыяльныя рэсурсы зімой 1943–1944 гг. практычна не выдзяляліся. У сваіх успамінах К.К. Ракасоўскі (на той час камандуючы Беларускім фронтам) апісвае сітуацыю наступным чынам: «По всему чувствовалось, что центр тяжести Ставка перенесла на Украину и вообще на южное крыло советско-германского фронта. Туда направлялись соединения из резерва Ставки – общевойсковые и танковые армии, танковые корпуса, артиллерийские соединения, танки, пушки, самолеты. Белорусский фронт не получал в то время ничего, хотя задача наша оставалась прежней. Мы должны были наступать, а сил у нас оставалось все меньше, о чем Ставка прекрасно знала. Но мы понимали, что иначе нельзя. Наша задача – активными действиями приковать к себе как можно больше вражеских сил и тем самым облегчить наступление на главном направлении. И мы прилагали все усилия, чтобы выполнить эту задачу. На крупные успехи не рассчитывали, но и на месте не стояли» [2].

## Прабіцца да Віцебска

Вясной 1944 г. галоўныя падзеі на цэнтральным участку савецка-германскага фронту разгарнуліся на ўсходзе Віцебскай вобласці. У адпаведнасці з патрабаваннямі дырэктывы Стаўкі ВГК ад 26 лютага 1944 г. войскі Заходняга фронту зноў разгарнулі наступленне на віцебскім напрамку. Для правядзення наступальнай аперацыі (29 лютага – 5 сакавіка 1944 г.) было сканцэнтравана 15 стралковых дывізій са складу 39, 33 і 5-й армій Заходняга фронту, а таксама былі прыцягнуты дадаткова 14 стралковых, артылерыйскіх і танкавых брыгад, 10 артылерыйскіх палкоў Рэзерву Галоўнакамандавання (РГК) і 87 танкаў. Праціўнік меў у гэтым раёне 5 пяхотных дывізій, 10 артпалкоў і 90 танкаў [1].

Перад фронтам 39-й арміі (камандуючы – генерал М.Э. Берзарын) у канцы лютага 1944 г. дзеяннямі разведвальных атрадаў было выяўлена аслабленне праціўніка і актыўны рух яго дробных груп і транспарту ў напрамку Віцебска. У такой сітуацыі камандуючы арміяй вырашыў пачаць праслед нямецкіх падраздзяленняў. Падчас наступальных дзеянняў, якія пачаліся ў другой палове дня 29 лютага 1944 г. сіламі 134, 262, 19 і 17-й стралковых дывізій, праціўнік за першы дзень быў выбіты з населеных пунктаў Стугрова, Абухава (12 км на ўсход ад Віцебска), Цішкава, Навасёлкі, Козікі. Пасля аднаўлення наступлення 1 сакавіка 1944 г. часці арміі прасунуліся за дзень на 5 км і выйшлі на лінію Канчаны (12 кіламетраў на паўночны ўсход ад Віцебска) – Баравыя – Яськова – Абухава – Аржалава – Пруднікі. На цэнтральным участку паласы наступлення 39-й арміі савецкія войскі прабіліся на 3 км і авалодалі населенымі пунктамі Скуратава і Раманава за 10 км на ўсход





Савецкія войскі на віцебскім напрамку. Канец зімы – пачатак вясны 1944 г.

ад Віцебска. Пераслед праціўніка завяршыўся 3 сакавіка, бо гітлераўскае камандаванне арганізавала на новым рубяжы моцнае агнявое супраціўленне і правяло контратакі. Левафланговыя часці 262-й стралковай дывізіі, якія змаглі 4 марта 1944 г. прабіцца яшчэ на адзін кіламетр, у далейшым замацаваліся на дасягнутых рубяжах [1].

Пры разгортванні наступу 39-й арміі на віцебскім кірунку з 29 лютага да 5 сакавіка 1944 г., па меркаванні Стаўкі ВГК, былі дапушчаны пралікі на ўсіх узроўнях. Камандаванне арміі недакладна вызначыла глыбіню адыходу праціўніка, таму яго пераслед праводзіўся без уліку магчымых контрдзеянняў не буйнымі групіроўкамі, а распыленымі сіламі. Штаб арміі не змог правільна арганізаваць узаемадзеянне пяхоты з танкамі і не забяспечыў іх артылерыяй для падаўлення агнявой сістэмы ворага. Парушалася кіраванне палкамі і батальёнамі. На дзеяннях войск адмоўна адбілася нізкая ўкамплектаванасць асабовым складам на ўзроўні ротнага звяна і дэфіцыт снарадаў буйных калібраў [1].

Вясновы наступ 33-й (камандуючы – генерал В.М. Гордаў) і 5-й (камандуючы – генерал М.І. Крылоў) армій на віцебскім напрамку пачаўся 2 сакавіка 1944 г. і праводзіўся з мэтай перарэзаць чыгунку на ўчастку Паддубляны – Чарапіі. Артылерыйская падрыхтоўка, якая папярэднічала наступленню войск, не змагла падавіць агнявую сістэму немцаў. Дзве правафланговыя дывізіі 5-й арміі ў першыя два дні наступлення ў баях на ўчастку Карпавічы – Рошча на паўднёвы захад ад Макарава сустрэлі моцнае агнявое супраць дзеянне праціўніка і таму руху наперад не мелі. Напрыклад, на 3 сакавіка 1944 г. у паласе 5-й арміі дзейнічала 18 артылерыйскіх і 8 мінамётных батарэй праціўніка. На працягу першай паловы дня 4 сакавіка 1944 г. часці 97-й і 277-й стралковых дывізій тройчы безвынікова атакавалі немцаў на ўчастку Карпавічы – Рошча. У другой палове дня 4 сакавіка 1944 г. пазіцыі 338-й дывізіі ў раёне населенага пункта Рэчкі падвергліся моцнаму артылерыйскаму ўдару і атакам да двух батальёнаў пяхоты гітлераўцаў, якія былі паспяхова адбіты савецкімі войскамі. У паласе 33-й арміі баі на працягу чатырох дзён вяліся за авалоданне варожымі апорнымі пунктамі Рогі (8 км на поўдзень ад Віцебска), Парацькова, Жукі, Новікі, Перавоз, размешчаных уздоўж ракі Лучоса [1].

У выніку наступальных дзеянняў 29 лютага – 5 сакавіка 1944 г. правафланговыя арміі Заходняга фронту здолелі прарваць абарону немцаў толькі ад 2 да 6 км. Чарговы раз не ўдалося прабіцца да Віцебска з паўднёва-ўсходняга і паўднёвага напрамкаў. Прычынамі няўдач у асноўным з'явіліся пралікі ў кіраўніцтве баявымі дзеяннямі з боку камандавання. Не было належным чынам наладжана ўзаемадзеянне пяхоты з артылерыйскімі і танкавымі падраздзяленнямі. Падчас артылерыйскай падрыхтоўкі стралковыя падраздзяленні пазніліся з пачаткам атакі. Акрамя таго, на выкананне баявых задач негатыўны ўплыў аказвала нізкая ўкамплектаванасць падраздзяленняў, часцей і злучэнняў. Баявы рух армій правага крыла Заходняга фронту прыкметна ўскладняўся наяўнасцю ў гітлераўскага камандавання магчымасцей манеўраваць асабовым складам і агнявымі сродкамі вакол Віцебска. Падчас наступальнай аперацыі на віцебскім напрамку з 29 лютага па 5 сакавіка 1944 г. страты войск Заходняга фронту склалі 11 855 чалавек: 2650 забітымі і 9205 параненымі [1].

## Наступальныя дзеянні на аршанскім напрамку 5–9 сакавіка

Рашэнне гэтай баявой задачы было ўскладзена на войскі 31-й арміі (камандуючы – генерал У.А. Глуздоўскі) Заходняга фронту. Для ўзмацнення яе наступаль-

ных магчымасцей з 29 лютага па 3 сакавіка ёй былі перададзены 61-ы і 62-і стралковыя корпусы з 49-й арміі (камандуючы – генерал І.Ц. Грышын). Па стане на 4 сакавіка 1944 г. у 31-й арміі было 8 стралковых дывізій, 3 артылерыйскія брыгады, 6 артылерыйскіх палкоў РГК, танкавая брыгада, 2 танкавыя палкі (усяго 80 танкаў). Суадносіны сіл былі наступныя: 31-я армія пераўзыходзіла праціўніка па асабовым складзе ў 1,7 раза, па артылерыі і мінамётах у 1,5 раза, па танках і САУ (самаходных артылерыйскіх установках) у 1,2 раза. На напрамку галоўнага ўдару перавага наступаючых савецкіх войск была абсалютнай. Перад 31-й арміяй была пастаўлена задача ўдарнай групіроўкай на сваім левым фланзе прарваць абарону праціўніка на ўчастку Асінторф – Пушча (26 км на паўночны ўсход ад Оршы), затым перамяшчэннем уздоўж Мінскай шашы авалодаць прамежкавымі пазіцыямі ворага і выйсці на лінію Выдрыца – Гацькаўшчына. У якасці канчатковай мэты наступлення ставілася вызваленне г. Орша [1].

Часці стралковых дывізій 31-й арміі да канца першага дня наступу, нягледзячы на развітую сістэму абарончых збудаванняў, густую сетку мінных палёў, контратакі праціўніка пры падтрымцы танкаў, здолелі выбіць немцаў з першай лініі траншэй на ўчастку Асінстрой – Лабаны і ўклініцца ў абарону ворага на адзін кіламетр. Увечары 6 сакавіка, пераадолеўшы моцнае агнявое супраціўленне і контратакі гітлераўцаў, савецкія войскі вялі бой за другую лінію траншэй праціўніка і знішчылі за дзень наступлення да 1 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў. Некалькі дзён асабовы склад 61-га і 71-га стралковых корпусаў вёў цяжкія баі з гітлераўцамі, якія прымянялі моцныя артылерыйскія і мінамётныя ўдары, праводзілі контратакі з раёна Асінторф і Ласыршчыкі. Акрамя таго, у другой палове 9 сакавіка 1944 г. нямецкая авіяцыя дзвюма групамі па 22 і 27 самалётаў бамбіла пазіцыі савецкіх войск у раёнах Новае Сяло і Судзілавічы, а 10 сакавіка тут жа дзейнічалі групы ад 8 да 25 нямецкіх пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў. Авіяцыйная падтрымка пазіцый за 8–10 кіламетраў на поўнач ад Дуброўны дазволіла германскім часцям пасля 6-гадзіннага бою вярнуць другую лінію сваіх траншэй. За два дні баёў зенітная артылерыя 31-й арміі збіла 12 варожых самалётаў. У наступныя дні войскі арміі адбівалі атакі 78-й пяхотнай дывізіі вермахта каля ракі Чарніца за 4 км на поўнач ад населенага пункта Бабінавічы і былі вымушаны адысці на яе ўсходні бераг [1, 3].

Удары савецкіх войск 5–9 сакавіка 1944 г. на аршанскім напрамку не прынеслі чаканага выніку. Пяхота пры наступленні затрымалася на першай лініі траншэй і тым самым дала магчымасць праціўніку адарвацца і затым пры падтрымцы бамбардзіровачнай авіяцыі перайсці ў контрнаступленне. Падчас баявых дзеянняў выявілася слабая вывучка пяхоты, а таксама недастатковая арганізацыя ўзаемадзеяння паміж родамі войск і ўнутры іх [1].

## Багушэўская наступальная аперацыя (21–29 сакавіка)

У трэцяй дэкадзе сакавіка 1944 г. войскамі 33-й (камандуючы – генерал І.Я. Пятроў) і 5-й арміі Заходняга фронту было разгорнута наступленне на багушэўскім напрамку. Па стане на 21 сакавіка 33-я армія ўключала ў свой склад 9 стралковых дывізій, 10 артылерыйскіх брыгад, 6 артылерыйскіх палкоў РГК, 5 танкавых брыгад, 4 палкі САУ. Усяго на ўзбраенні арміі было 73 танкі. Праціўнік меў 2 пяхотныя дывізіі, да 5 артылерыйскіх палкоў і каля 40 танкаў [1].

У якасці галоўнай аперацыі ставілася задача перакрыць участак чыгункі Віцебск – Орша. У выніку наступальных дзеянняў 42, 173, 215, 199-й стралковых дывізій пры падтрымцы 23-й і 123-й танкавых брыгад савецкім войскам за 21–23 сакавіка, пераадольваючы ўпартае супраціўленне праціўніка, удалося прабіцца ўздоўж шашы Віцебск – Орша на 1,5–2 км. Пры гэтым войскі арміі авалодалі моцнымі апорнымі пунктамі праціўніка Зазыбы, Касачы, Языкава, Шаркі (за 18 км на паўночны ўсход ад Багушэўска), Кузьмянцы, Яфрэменкі. Аднак развіць гэты поспех савецкім часцям не



Планы савецкага камандавання на зіму і вясну 1944 г.

ўдалося. Больш за тое, ужо раніцай 24 сакавіка ў выніку контратак немцаў войскам арміі давялося пакінуць Шаркі і Кузьмянцы. На працягу наступных дзён савецкія воіны адбівалі контратакі праціўніка, якія ажыццяўляліся пры падтрымцы танкаў і самаходных установак з раёна Завараць (18 км на паўночны ўсход ад Багушэўска). Прасоўванню войск сур'ёзна перашкаджала варожая авіяцыя, якая пастаянна бамбіла групай з 8 самалётаў пазіцыі армейскіх часцей у раёне населенага пункта Шалягі. Падчас аднаўленага 28 сакавіка 1944 г. наступлення на ўчастку Замашэнкі – Яфрэменкі часці арміі, адбіўшы тры контратакі гітлераўцаў, вялі баі за населеныя пункты Блакітныя, Шаркі, Кузьмянцы, аднак не змаглі прабіцца наперад з прычыны арганізаванага супраціўлення немцаў [1, 3].

На багушэўскім напрамку ва ўзаемадзеянні з левафланговымі часцямі 33-й арміі ажыццяўляла наступленне 5-я армія. Сіламі 277, 184 і 157-й стралковых дывізій 21 сакавіка 1944 г. былі атакаваны пазіцыі немцаў на лініі Бабавікі – Баранава і заняты населеныя пункты Бабавікі, Старына, а таксама заходняя ўскраіна Баранава за 24 км на паўднёвы ўсход ад Віцебска. За першы дзень баёў было знішчана да 500 нямецкіх салдат і афіцэраў, 10 гармат, 8 мінамётных батарэй, спалены танк. Наступнымі ўдарамі ў бок населенага пункта Высачаны часці 72-га стралковага корпуса авалодалі апорным пунктам Баранава. Нягледзячы на ўпартае агнявое супраціўленне і контратакі ворага, два палкі 184-й стралковай дывізіі 23 сакавіка 1944 г. фарсіравалі раку Сухадроўка і вялі бой за вёску Буракі-1. У гэты ж дзень два палкі 157-й стралковай дывізіі фарсіравалі раку Ласасіна на паўночны захад ад населенага пункта Чаркасы і авалодалі першай траншэяй немцаў. Атакі правафланговых часцей арміі на пазіцыі гітлераўцаў у раёне Яфрэменкі былі спынены моцным агнём праціўніка. Наступленне 5-й арміі, якое аднавілася 28 сакавіка на пазіцыі праціўніка ў ранейшым раёне, дазволіла толькі авалодаць лясным масівам на паўночны ўсход ад паселішча Буракі [1, 3].

Войскі 33-й і 5-й арміі ў аперацыі на багушэўскім напрамку 21–29 сакавіка 1944 г. не здолелі выканаць задачу, пастаўленую перад імі камандаваннем Заходняга фронту. У ходзе наступальных дзеянняў часцям і злучэнням давялося сутыкнуцца з арганізаваным супраціўленнем, моцным агнявым процідзеяннем і контратакамі з удзелам танкаў і самаходных установак. Значнай перашкодай была варожая авіяцыя, якая наносіла ўдары групамі па баявых парадках наступаючых часцей. У такой абстаноўцы савецкія войскі за дзевяць дзён прарваліся наперад толькі ад 1 да 3,5 км. Адной з прычын невыканання пастаўленых баявых задач з'явіўся некамплект асабовага складу ў часцях і злучэннях. Так, 157-я і 97-я стралковыя дывізіі 5-й арміі налічвалі толькі 3702 і 3897 чалавек адпаведна. Пры правядзенні аперацыі выявіліся пралікі ў дзейнасці камандзіраў, штабоў і службаў, у падрыхтоўцы асабовага складу. Стралковыя падраздзяленні ў баі губляліся, агонь па варожай пяхоце не вялі. Разам з недахопам снарадаў неабходных калібраў для гармат і мінамётаў мела месца недастатковая вывучка артылерыстаў, што не дазваляла падавіць агнявую сістэму ворага і аказаць неабходную дапамогу наступаючай пяхоце. Істотныя недахопы праявіліся і ў захаванні ў тайне плана наступальных дзеянняў войск [1].

Прычыны няўдач войск Заходняга фронту сталі прадметам вывучэння Надзвычайнай камісіі пад кіраўніцтвам члена Дзяржаўнага камітэта абароны Г.М. Маленкова, накіраванай у войскі Стаўкай ВГК. Па выніках яе работы 11 красавіка 1944 г. быў падрыхтаваны спецыяльны даклад, у якім разам з выяўленымі недахопамі былі прапанаваны кадравыя і арганізацыйныя змены ў войсках заходняга стратэгічнага напрамку. Загадам Стаўкі ВГК ад 12 красавіка 1944 г. новым камандуючым войскамі Заходняга фронту быў прызначаны генерал-палкоўнік І.Д. Чарняхоўскі, а 24 красавіка 1944 г.



Наступальныя дзеянні 2-га Беларускага фронту 24.02–05.04.1944 г.

гэты фронт быў перайменаваны ў 3-ці Беларускі. На аснове армій левага крыла Заходняга фронту быў сфарміраваны 2-гі Беларускі (другога фарміравання) пад камандаваннем генерал-палкоўніка І.Я. Пятрова [1].

Наступальныя аперацыі 1-га Прыбалтыйскага і Заходняга франтоў на беларускім напрамку ў студзені – сакавіку 1944 г. прывялі толькі да нязначнага ўкліньвання ў абарону праціўніка.

Нягледзячы на гэта, савецкія войскі трымалі ў пастаянным напружанні 3-ю танкавую і 4-ю армію вермахта, скоўвалі іх сілы і нанеслі ім значны ўрон. У выніку актыўных дзеянняў гэтых двух франтоў Чырвонай арміі гітлераўскае камандаванне не змагло перакінуць свае сілы і сродкі на паўночнае і паўднёвае крыло савецка-германскага фронту, дзе Савецкім Саюзам вырашаліся стратэгічныя задачы ўсёй зімова-вясновай ваеннай кампаніі 1944 г.

## Палеская наступальная аперацыя (15 сакавіка – 4 красавіка)

Наступальныя баявыя дзеянні на тэрыторыі рэспублікі вясной 1944 г. праводзілі таксама часці правафланговай групіроўкі 2-га Беларускага фронту (камандуючы – генерал П.А. Курачкін), які быў створаны паводле дырэктывы Стаўкі ВГК 17 лютага 1944 г. для прыкрыцця правага крыла групіроўкі савецкіх войск на тэрыторыі Правабярэжнай Украіны і разгортвання актыўных баявых дзеянняў на ковельска-брэсцкім напрамку паміж 1-м Беларускім і 1-м Украінскім франтамі [4].

У Палескай аперацыі ў якасці адной з задач 2-га Беларускага фронту прадугледжвалася наступленне войск яго правага крыла на ўчастку Тураў – Давыд-Гарадок – Столін. На гэтым рубяжы дзейнічалі часці і злучэнні 9-га гвардзейскага стралковага корпуса – ударнай групіроўкі 61-й арміі (камандуючы – генерал П.А. Бялоў). Войскі корпуса займалі паласу шырынёй 24 км і 16 сакавіка 1944 г. перайшлі ў наступленне, вялі баі ў раёне населеных пунктаў Церабяжоў (9 км на паўднёвы захад ад Століна), Гарадная (22 км на захад ад Століна), Жолкіна [5, 6].

На працягу 17–25 сакавіка 1944 г. войскі 61-й арміі, пераадольваючы моцнае агнявое супраціўленне і пастаянныя контратакі праціўніка, авалодалі некалькімі населенымі пунктамі, у тым ліку Жолкіна, Ласіцк, Востраў. Найбольш упартыя баі разгарнуліся ў раёне Церабяжаў і Гарадная. За 10 дзён удалося прабіцца наперад на 4–8 км, аднак пастаўленая задача не была выканана. Часці і злучэнні арміі ачысцілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў толькі невялікі ўчастак правага берага Прыпяці і не змаглі ліквідаваць плацдарм праціўніка ў раёне Століна [1, 3, 6].

Асноўнымі прычынамі няўдачы 61-й арміі ў Палескай аперацыі з’явіліся недастатковы ўзровень кіравання войскамі, слабая арганізацыя разведкі, слабая агнявая падтрымка часцей і злучэнняў. У сувязі з тым, што аб’екты ўдараў не былі разведаныя, артылерыі давялося весці агонь пераважна па плошчах, пры шчыльнасці ўсяго 15–18 арудзій на кіламетр фронту. З-за слабой укамплектаванасці асабовым складам і баявой тэхнікай, спазнення з перабазіраваннем, неспрыяльных умоў надвор’я авіяцыя 6-й паветранай арміі (камандуючы – генерал Ф.П. Палынін) не змагла эфектыўна падтрымліваць наземныя войскі. 5 красавіка 1944 г. у адпаведнасці з дырэктывай Стаўкі ВГК 2-гі Беларускі фронт быў расфарміраваны, а яго войскі перададзены ў склад 1-га Беларускага фронту, які сваім левым флангам яшчэ да 19 красавіка рабіў спробы вызваліць Ковель [1].

У цэлым войскам трох франтоў на заходнім стратэгічным напрамку зімой – вясной 1944 г. не ўдалося ў поўнай меры выканаць задачы Стаўкі ВГК і выйсці на рубеж Полацк – Лепель – Магілёў – рака Пціч. Пры гэтым у выніку наступальных аперацый ворагу былі нанесены значныя страты. Чырвонай арміяй былі вызвалены Мазыр, Калінкавічы, Ельск, Лельчыцы, Рагачоў і сотні іншых населеных пунктаў Усходняй Беларусі, выратаваны ад гібелі і фашысцкай няволі сотні тысяч савецкіх грамадзян [7].

У сярэдзіне красавіка 1944 г. Стаўка ВГК загадала войскам заходняга стратэгічнага напрамку перайсці да абароны, замацавацца на займаных рубяжах, што было звязана з падрыхтоўкай да летніх наступальных аперацый. ■

Иллюстрации из открытых интернет-источников


**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Великая Отечественная война 1941–1945 годов. В 12 т. Т. 4. Освобождение территории СССР. 1944 год. – М., 2012.
2. Рокоссовский К.К. Солдатский долг / К. К. Рокоссовский. – Минск, 1984.
3. Великая Отечественная война – день за днем (по материалам рассекреченных оперативных сводок Генерального штаба Красной Армии). Т. 7. Прорыв к государственной границе 1 января – 30 июня 1944 г. – М., 2010.
4. Советская военная энциклопедия. В 8 т. Т.1. – М., 1976.
5. Советская военная энциклопедия. В 8 т. Т.6. – М., 1978.
6. Цэнтральны архіў Міністэрства абароны – Ф. 418. Воп. 10695. Спр. 385.
7. История Второй мировой войны 1939–1945. В 12 т. Т. 8. – М., 1977.